КРАЕВЕДЧЕСКИЙ КЕЙС СОЛИГОРСКА

# Аб чым гаворыць выстаўка бытавых вырабаў

У мінулую нядзелю ў раённым Доме культуры г. п. Старобіна была арганізавана выстаўка прадукцыі раённага камбіната бытавога абслугоўвання. На выстаўку былі прадстаўлены ў шырокім асартыменце вырабы шавецкіх і кравецкіх майстэрань, работы мастакоў, фотаздымкі і партрэты. На выстаўцы дэманстраваліся фасоны мужчынскага, жаночага, дзіцячага зімовага і летняга адзення, пашытага ў бытавых камбінатах Старобіна, Салігорска і Чырвонай Слабады.

Трэба сказаць, што такое мерапрыемства выклікала вялікую цікавасць. Ды яно і зразумела: кожны хацеў паглядзець, на што здольны майстры камбіната, як абстаяць справы з бытавым абслугоўваннем насельніцтва. На працягу ўсяго дня ў клубе было многа людзей. Наведвальнікі пахвалілі многія вырабы гатовага адзення, у прыватнасці, вопратку закройшчыка Патыкайліка, карціны мастака Штайды. Адчуваецца, што майстры ўкладваюць душу ў тое, што робяць для людзей.

Разам з гэтым выстаўка паказала, што кравецкія майстэрні плятуцца ў хвасце адносна многіх фасонаў вопраткі. Жаночае адзенне павінна быць лёгкім і зручным, без усякіх паясоў, падкрэсліваць прыгажосць фігуры. Тым не менш краўцы не лічацца з гэтым, працягваюць шыць вопратку ўстарэлых фасонаў.

Многія наведвальнікі спадзяваліся, што ўбачаць мужчынскія касцюмы, адпавядаючыя сучаснай модзе. Але, на жаль, краўцы камбіната іх надзеі не апраўдалі.

Яшчэ адна характэрная дэталь. У сваім дакладзе аб рабоце райбыткамбіната дырэктар тав. Спірын сцвярджаў, што камбінат працуе добра, перавыконвае плановыя заданні. Але гэта робіцца ў асноўным за кошт паслуг, аказваемых гарадскому насельніцтву. За 8 месяцаў на аднаго шахцёра аказана бытавых паслуг больш чым на 3 руб. 70 кап., тады як бытавыя паслугі для сельскага насельніцтва на аднаго чалавека складаюць усяго 22 капейкі. Хаця план і выконваецца, але бытавікі далёка адсталі ад тых задач, якія цяпер стаяць перад імі. Яны павінны давесці аказанне бытавых паслуг на душу насельніцтва за год да 13 рублёў.

На выстаўцы была прадстаўлена таксама прадукцыя быткамбінатаў райспажыўсаюза, але выглядала яна вельмі бедна. Гэта гаворыць аб тым, што райспажыўсаюз мала яшчэ клапоціцца аб бытавым абслугоўванні працаўнікоў сельскай гаспадаркі.

Выстаўка, якую арганізаваў райбыткамбінат, — вельмі важнае мерапрыемства. І хацелася б, каб у далейшым старобінскія бытавікі парадавалі нас яшчэ лепшымі поспехамі.

**І. МАРКАВЕЦ.**